ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Гомельскі універсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ І ПРАФКОМАЎ ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

№ 12 (648) | Аўторак, 7 красавіка 1987 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года. | Выходзіць раз у тыдзень | Цана 2 кап.

# ДЫПЛОМ ЗАВОЧНІКА

У прынятай 25 сакавіка г. г. ЦК КПСС і Саветам Міністраў СССР пастанове «Аб мерах па карэннаму паляпшэнню якасці падрыхтоўкі і выкарыстання спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй у народнай гаспадарцы» падкрэсліваецца неабходнасць усебаковага ўдасканалення сістэмы падрыхтоўкі спецыялістаў без адрыву ад вытворчасці, ухілення меўшых месца ў гэтай справе недахопаў.

Роля завочнай адукацыі ў сучасных умовах усё больш узрастае. Таму стала заканамернай тая значная работа па падрыхтоўцы спецыялістаў без адрыву ад вытворчасці, якая праводзіцца ў нашым універсітэце. Завочнае навучанне ў ім ажыццяўляецца па 8 спецыяльнасцях. Усяго на завочным факультэце цяпер атрымліваюць вышэйшую адукацыю звыш трох тысяч чалавек.

Агульнавядома, што арганізацыя і правядзенне вучэбнага працэсу са студэнтамі-завочнікамі з'яўляецца больш складанай, чым на стацыянары. У сувязі з гэтым асаблівае значэнне набывае пытанне забеспячэння завочнага факультэта высокакваліфікаванымі кадрамі выкладчыкаў. Яно ў нас вырашаецца паспяхова. Пры планаванні і размеркаванні вучэбнай нагрузкі кафедры імкнуцца выдзеліць для чытання лекцый і правядзення семінарскіх заняткаў на завочным факультэце найбольш кваліфікаваных і вопытных педагогаў. З 311 выкладчыкаў, якія працуюць з завочнікамі, больш палавіны маюць вучоныя ступені і званні. Сярод іх — 7 дактароў навук, прафесараў. У апошнія гады універсітэт стаў больш актыўна прыцягваць да правядзення заняткаў на завочным факультэце ГДУ высокакваліфікаваных спецыялістаў з прадпрыемстваў і арганізацый, асабліва па эканамічных спецыяльнасцях.

Вучэбны працэс на завочным факультэце дзеліцца на вучэбна-экзаменацыйныя сесіі і перыяд міжсесійнай самастойнай работы студэнтаў. Вучэбна-экзаменацыйныя сесіі ў нас праводзяцца два разы ў год у найбольш зручныя для студэнтаў тэрміны. Тут таксама ўлічваюцца прапановы прадпрыемстваў, арганізацый і ўстаноў, дзе працуюць студэнты-завочнікі.

У наступным навучальным годзе для студэнтаў-эканамістаў 4-га курса ў парадку эксперыменту вучэбна-экзаменацыйныя сесіі будуць праводзіцца зімой, вясной і восенню. На наш погляд, такі графік вучэбнага працэсу яшчэ ў большай ступені паслужыць інтарэсам саміх студэнтаў і тых калектываў, у якіх яны працуюць.

Перад пачаткам сесіі, як правіла, праводзяцца студэнцкія сходы і асобна сходы старaст груп, на якіх абмяркоўваюцца вынікі папярэдняй сесіі, выяўляюцца недахопы ў арганізацыі і правядзенні вучэбна-метадычнай работы, стан дысцыпліны і г. д.

Штомесячна ў нас праводзіцца дзень завочніка. У гэты дзень студэнты маюць магчымасць атрымаць кансультацыю, ліквідаваць акадэмічную запазычанасць, сустрэцца з цікавымі людзьмі.

Важнейшай умовай поспеху з'яўляецца правільна арганізаваная і планамерная работа студэнта-завочніка ў міжсесійны перыяд. У гэтай справе першарадную ролю адыгрываюць кафедры. Яны распрацоўваюць метадычныя дапаможнікі, складаюць кантрольныя заданні, праводзяць калёквіумы па найбольш складаных тэмах курса, арганізуюць кансультацыі (пісьмова або па тэлефоне) і інш.

Адной са спецыфічных форм на завочным факультэце з'яўляюцца кантрольныя работы. Праўда, аб іх па ўпўне зразумелых прычынах выказваюцца розныя меркаванні. Гэта пытанне абмяркоўвалася ўсебакова і на кафедрах нашага універсітэта. Мы прыйшлі да вываду, што для большасці дысцыплін кантрольныя работы трэба пакінуць, але гэта не азначае, што нельга шукаць іншых форм кіраўніцтва і кантролю за самастойнай работай студэнтаў. Напрыклад, пераводу некаторых кантрольных работ на вусны залік або правядзенне аўдыторных пісьмовых заданняў.

Вялікае месца ў вучэбным працэсе са студэнтамі-завочнікамі адводзіцца вучэбным, вытворчым і педагагічным практыкам. Студэнты праходзяць іх ва ўстановах, на прадпрыемствах, у гаспадарках па спецыяльнасцях, якія адпавядаюць той, па якой яны вучацца. Студэнты педагагічных спецыяльнасцей праходзяць практыку ў школах, часцей за ўсё па месцу жыхарства. Тыя, хто працуе па спецыяльнасці, адпавядаючай профілю факультэта, ад практыкі вызваляюцца.

Падрыхтоўка высокакваліфікаваных спецыялістаў універсітэцкага профілю немагчыма без прывіцця навыкаў навуковага даследавання. Іх можна выпрацаваць толькі ў працэсе ўдзелу студэнтаў у навуковай рабоце, да якой штогод прыцягваецца ўсё большая колькасць завочнікаў.

Вядома, што студэнту-завочніку вучыцца намнога цяжэй, чым стацыянарніку. Таму для яго неабходна стварыць нармальныя ўмовы па месцу работы. Практыка паказвае, калі яны забяспечаны, дык і поспехі значна вышэйшыя. І наадварот. Трэба, каб адміністрацыя і грамадскія арганізацыі прадпрыемстваў і ўстаноў пастаянна клапаціліся аб тых, хто набывае вышэйшую адукацыю без адрыву ад вытворчасці, забяспечвалі для іх у вучобы спрыяльныя ўмовы, рацыянальна выкарыстоўвалі студэнтаў-завочнікаў як у перыяд вучобы, так і пасля яе завяршэння.

Такім чынам, калі ўлічваць усе абставіны, а іменна: патрабаванні часу, цяжкасці завочнага навучання, базу, якую мы маем цяпер, і многае іншае, дык узнікае пытанне — якія ж далейшыя перспектывы падрыхтоўкі спецыялістаў на завочным факультэце ГДУ? Можна з упэўненасцю сказаць: для цэлага раду спецыяльнасцей завочнае навучанне мае базу на многа гадоў наперад. Маюцца на ўвазе перш за ўсё педагагічныя спецыяльнасці. Вядома, што толькі ў Гомелі і нашай вобласці працуе звыш тысячы настаўнікаў, якія не маюць вышэйшай адукацыі. Вялікім рэзервам для педагагічных спецыяльнасцей завочнага факультэта з'яўляецца пянерская работнікі. Ёсць таксама база для такіх спецыяльнасцей, як эканоміка працы, арганізацыя механізаванай апрацоўкі эканамічнай інфармацыі і інш. У выніку праведзенай праверкі выяўлена, што сярод інжынераў вылічальных цэнтраў і АСК горада і вобласці маюць адпаведную адукацыю займаемым пасадам усяго толькі 30—40% работнікаў. Такім чынам, пры грунтоўнай падрыхтоўцы да прыёму новага кантынгента можна дабіцца таго, каб на завочным факультэце не аказалася выпадковых студэнтаў, а вучыліся тут іменна тыя, для каго патрэбна, скажам, педагагічная або эканамічная адукацыя ў адпаведнасці з профілем работы.

**Л. СЕЧКА,**
**прарэктар па завочнаму навучанню, дацэнт.**

*Да агульнауніверсітэцкага партыйнага сходу*

# ВУЧЭБНАМУ ПРАЦЭСУ — АКТЫВІЗАЦЫЮ

«Асноўныя напрамкі перабудовы вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі ў краіне», якія зацверджаны ЦК КПСС і цяпер знаходзяцца ў цэнтры ўвагі савецкіх людзей, выклікаюць роздумы ў кожнага работніка вышэйшай школы. Ва ўсіх нас адна задача: што неабходна зрабіць, каб у самы кароткі час прыкметна павысіць якасць падрыхтоўкі будучых спецыялістаў, якім жыць і працаваць у новым тысячагоддзі. У гэтай сувязі хачу выказаць некаторыя асабістыя прапановы.

На мой погляд, у лекцыях па грамадскіх і эканамічных дысцыплінах для ўзбуджэння ў студэнтаў навуковай цікавасці да прадмета трэба абавязкова праводзіць дыскусіі вакол спрэчных праблем; паказваць на канкрэтных прыкладах ролю і значэнне чытаемых курсаў для практыкі гаспадарчага будаўніцтва. У лекцыях і на практычных занятках неабходна шырэй выкарыстоўваць мясцовы матэрыял.

Вельмі карысным будзе, калі на кафедрах і метадычных семінарах факультэтаў, перад студэнцкай аўдыторыяй пачнуць выступаць з дакладамі па пытаннях гаспадарчай практыкі кіруючыя работнікі горада і вобласці.

Лічу, што пры скарачэнні колькасці лекцыйных заняткаў ні ў якім разе нельга парушаць прынцып іх сістэмнасці і паслядоўнасці. У скарочаным курсе лекцый павінны знайсці адлюстраванне ўсе галоўныя пытанні, прадугледжаныя праграмай вывучаемага прадмета. Трэба, каб яго навуковы ўзровень не зніжаўся, а наўхільна ўзрастаў пры захаванні яго метадалагічнай цэласнасці.

У мэтах эканомнага выкарыстання вучэбнага часу вельмі карысна працягваць работу па ўсіх кафедрах як па дакладнаму размежаванню аб'ектаў вывучэння ў асобных курсах, так і па знаходжанню стыкаў паміж курсамі, дзе можа мець месца плённая сувязь разглядаемых пытанняў.

З мэтай паляпшэння выхаваўчай работы пры выкладанні лекцыйных курсаў па грамадскіх і эканамічных дысцыплінах трэба сістэмна акцэнтаваць увагу на пытаннях па развіццю асобы студэнта ў камуністычным духу. Рашэнне выхаваўчых задач звязваць не толькі з лекцыямі і семінарскімі заняткамі. Важнейшае значэнне мае самастойная работа студэнтаў. На кожнай кафедры неабходна больш увагі ўдзяляць правільнай арганізацыі яе кіраўніцтвам. У студэнтаў трэба выхоўваць пераканаnасць, што ім пад сілу адолець любы цяжкі матэрыял, але пры выкананні абавязковай умовы — сістэматычных занятках, а не ад выпадку да выпадку. З выхаваўчымі задачамі самым цесным чынам звязана ўсё: ад рацыянальнай арганізацыі вучэбнага працэсу да афармлення і ўтрымання аўдыторый, калідораў, кафедр і г. д.

**В. ЦІШЧАНКА,**
**загадчык кафедры аналізу гаспадарчай дзейнасці, прафесар.**

# ПАТРЭБНА АГУЛЬНАЯ ЗАЦІКАЎЛЕНАСЦЬ

Адной з важных задач сістэмы вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі з'яўляецца ўдасканальванне разнастайных форм вучэбнай і выхаваўчай работы. Гэту задачу можна вырашыць толькі сумеснымі намаганнямі выкладчыкаў і студэнтаў.

Спачатку аб студэнтах. Не ўсе яны рэгулярна ходзяць на заняткі, паспяхова вучацца, праяўляюць актыўнасць у грамадскім жыцці, не працуюць над сваёй самаадукацыяй. І ў гэтым вінаваты яны самі. Але ж пэўная доля віны кладзецца тут і на выкладчыкаў, таму што якасць чытаемых імі лекцый не заўсёды адпавядае высокім патрабаванням часу, і студэнтам зусім нецікава слухаць іх. Іншых жа зусім не турбуе, колькі студэнтаў наведвае іх заняткі. Бескантрольнасць «расхалоджвае» студэнтаў.

Якія ж канкрэтныя меры неабходна прыняць, каб узняць на больш высокі ўзровень усю вучэбную і выхаваўчую работу? Хацелася б выказаць у сувязі з гэтым свае думкі. Каб зацікавіць будучых маладых спецыялістаў у вывучэнні раду дысцыплін, выкладчыкам неабходна павысіць якасць чытаемых імі лекцый, пастаянна ўдасканальваць свой прафесіянальны ўзровень, распрацаваць больш дзейсную сістэму праверкі самастойнай работы студэнтаў (не толькі калёквіумы і субяседаванні). Каб плённай і эфектыўнай была самападрыхтоўка студэнтаў, неабходна павялічыць універсітэцкі бібліятэчны фонд.

Актывізаваць сваю работу трэба таксама камітэтам камсамола і камсамольскім бюро факультэтаў. Іх членам неабходна часцей бываць у акадэмічных групах, цікавіцца іх жыццём, праблемамі, працаваць не ў адрыве, а ў кантакце з дэканатамі, камітэтам ЛКСМБ універсітэта, парткомам, прафкомам. Недасканалай, на мой погляд, з'яўляецца сістэма заахвочвання і спагнанняў для студэнтаў.

Жыццё на факультэтах будзе па-сапраўднаму цікавым, насычаным, калі камсамольскія арганізацыі будуць узначальваць людзі з дзелавымі якасцямі, добрымі арганізатарскімі здольнасцямі, тыя, каго студэнты паважаюць.

**С. ЛЫСЕНКА,**
**сакратар камітэта камсамола гісторыка-філалагічнага факультэта.**

## З УЗНАГАРОДАЙ!

За шматгадовую плённую працу, актыўны ўдзел у грамадскім жыцці і ў сувязі з 50-годдзем з дня нараджэння галоўны бухгалтар універсітэта КУРАВА Іраіда Антонаўна ўзнагароджана Ганаровай граматай Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР і Ганаровай граматай рэктарата, парткома і прафкома ГДУ.

## *Віншуем!*

Рэктарат, партком, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат матэматычнага факультэта, кафедра алгебры і геаметрыі горача віншуюць асістэнта гэтай кафедры СІДАРАВА Аляксандра Уладзіміравіча (навуковы кіраўнік — член-карэспандэнт АН БССР прафесар Л. А. Шамяткоў) з паспяховай абаронай дысертацыі на атрыманне вучонай ступені кандыдата фізіка-матэматычных навук.

*У праграме «Дзён гістфіла»*

# НЕ СТРАЦІЦЬ ГАЛОЎНАЕ...

**Закончыліся традыцыйныя «Дні гістфіла», а ўражанні ад іх не ўлегліся па сённяшні дзень. І з насычанай, цікавай праграмы студэнцкага свята, у якую ўваходзілі навуковая канферэнцыя, справаздачны канцэрт мастацкай самадзейнасці, аўкцыён, гумарына, спартыўныя спаборніцтвы, літаратурна-музычная кампазіцыя, хацелася б асобна выдзеліць апошнюю. Для яе была выбрана своеасаблівая строгая форма, якая максімальна падкрэслівала здзіўляючую цэльнасць і ўнутраную арганізаванасць матэрыялу.**

...У напружаную цемнату залы чакання ідуць словы: «Есть русская интеллигенция. Вы думали нет? Есть! Не масса индифферентная, а совесть страны и честь...». І нарастаючую паступова трывожную мелодыю змяняюць чыстыя гукі званоў. Дзве блукаючыя свечкі з'яўляюцца ў зале, і іх агонь высвечвае партрэт А. Вазнясенскага.

Так пачалася літаратурна-музычная кампазіцыя «Настальгія па цяперашняму», падрыхтаваная пяцікурсніцамі гістфіла І. Асташкевіч і Т. Праўдзівай, якая была паказана ў студэнцкім кафэ.

У аснову кампазіцыі пакладзена публіцыстыка А. Вазнясенскага і яго вершы, прысвечаныя В. Хадасевічу, Б. Пастэрнаку і У. Высоцкаму, а таксама творы названых паэтаў і музыка С. Рахманінава, Д. Шастаковіча, С. Пракоф'ева, Р. Шчадрына і Г. Свірыдава. Калі кароткая (усяго 45 мінут), але насычаная праграма закончылася, я задала некалькі пытанняў яе аўтарам:

**— Што прывяло вас да думкі аб стварэнні гэтай кампазіцыі і чаму вы далі ёй такую назву?**

І. АСТАШКЕВІЧ: Кожны дзень нашага жыцця, як правіла, запоўнены спешкай, мітуснёй, «утрасаннем» розных праблем, у выніку чаго знікае штосьці вельмі важнае, калі не сказаць — галоўнае. Гэта і ёсць тое сапраўднае, без чаго ніводнае чалавечае жыццё не можа лічыцца паўнацэнным. Смутак па ім, страх за яго лёс, яго будучыню і вызначылі тэму, а назвай для кампазіцыі паслужыў радок з аднайменнага верша А. Вазнясенскага.

**— Чым растлумачыць кола выбраных вамі імён?**

Т. ПРАЎДЗІВАЯ: Выбар, канешне, умоўны. Аднак мы свядома звярнуліся іменна да гэтых паэтаў, кожны з якіх нібы ўвасабляе пэўную вяху ў айчыннай культуры.

В. Хадасевіч, 100-годдзе з дня нараджэння якога споўнілася ў мінулым годзе, быў у свой час ацэнены Горкім, як «лепшы паэт сучаснай Расіі», аднак з 20-х гадоў не выдаваўся і быў незаслужана забыты. А. Вазнясенскі адраджае яго імя і таленавітыя вершы.

Ад жыцця Б. Пастэрнака, настаўніка і сябра Вазнясенскага, нас адмяжоўваюць два з паловай дзесяцігоддзі, але літаратурная спадчына паэта пачынае прыцягваць да сябе ўвагу толькі сёння.

І, нарэшце, У. Высоцкі, «хрыплы і эпахальны» голас якога знаёмы кожнаму з нас. «Калектыўнае прасвятленне» ў адносінах У. Высоцкага нарадзіла шмат публікацый, і ў гэтай сітуацыі вельмі важна зберагчы яго творчасць ад усяго чужога, каб не збылося яго горкае прароцтва і «отчаяньем сорванный голос» не ператварыўся б «в приятный фальцет».

**— Ці быў у вас разлік на пэўную падрыхтоўку публікі да ўспрыняцця вашай кампазіцыі?**

І. АСТАШКЕВІЧ: Не. Мы не аднойчы сутыкаліся з падачай літаратурных вечароў у нейкай адаптаванай форме, якая аблягчае разуменне матэрыялу. Але ў даным выпадку хацелася гаварыць з гледачом на роўных, таму была пэўная ступень рызыкі.

Цяпер можна з упэўненасцю сказаць, што работа І. Асташкевіч і Т. Праўдзівай знайшла водгук у сэрцах гледачоў і даказала тым самым, што яна дастойна ацэнкі больш шырокай аўдыторыі.

**А. КАЛЕЕВА,**
**мастацкі кіраўнік студэнцкага клуба «Маладосць».**



**Хутка стануць маладымі спецыялістамі пяцікурснікі біялагічнага факультэта. А пакуль што — заняткі ў лабараторыях.**

**НА ЗДЫМКУ: дацэнт кафедры фізіялогіі чалавека і жывёлін В. С. Аруцюнава са студэнткамі 5-га курса В. Кулыба, А. Целяпнёвай і Т. Радзьковай.**

**Фота С. Шаршэўскага.**

## ВЫЛУЧАЙЦЕ КАНДЫДАТАЎ

**Камісія абкома ЛКСМБ па прэміях камсамола Гомельшчыны ў галіне літаратуры, мастацтва, журналістыкі і архітэктуры прымае работы на прысуджэнне прэміі камсамола Гомельшчыны 1987 года да першага верасня гэтага года.**

Работы на атрыманне прэміі могуць вылучацца райкомамі, гаркомамі, камітэтамі камсамола, дзяржаўнымі і творчымі арганізацыямі.

По пытаннях, якія звязаны з умовамі вылучэння на прэміі, звяртацца ў камісію абкома ЛКСМБ па прэміях камсамола Гомельшчыны на адрас: **246000, г. Гомель, вул. Савецкая, 17, абком камсамола, тэлефоны: 55-71-88, 55-71-82.**

*За ўзорны парадак усюды і ва ўсім*

# КАЛІ НЕ МЫ, ДЫК ХТО?

Час перабудовы прымушае думаць. Што трэба зрабіць, якім павінен быць я сам, якім павінен быць наш калектыў, якой быць нашай ВНУ?

Тэзіс аб спецыялісту шырокага профілю не прадугледжвае, што кожны павінен выпраўляць недахопы ў рабоце іншых служб, калі ён іх убачыў. У нас жа часам здараецца наадварот. Тыя, хто павінен выправіць недахопы і памылкі, гавораць зрабіўшаму свае заўвагі: «Незадаволены, дык лепш зрабі сам».

Што можна зрабіць нам разам, каб наша ВНУ сапраўды з'яўлялася цэнтрам культуры? У першую чаргу, змяніць наша «навакольнае асяроддзе». Каб яно не дазваляла ні выкладчыку, ні студэнту паводзіць сябе некультурна. Аднак шэрыя сцены, убогае афармленне калідораў і холаў, неахайная ўборка памяшканняў і прывучаюць да ўсяго адносіцца абыякава. Студэнты — будучыя спецыялісты — не бачаць перад сабой узору для пераймання, для паводзін. Не так, як назіраецца ў нашай ВНУ, павінна працаваць кожная служба, каб усюды быў парадак, каб задаволіць самыя патрабавальныя густы, адпавядаць нарматыўным патрабаванням навукі.

Безумоўна, эканамічныя магчымасці ў нас абмежаваны, але ўсё роўна можна працаваць лепш. Так, да рамонту памяшканняў можна далучыць студэнтаў. У нас ва універсітэце за акадэмічнымі групамі замацаваны аўдыторыі з тым, каб у іх заўсёды падтрымліваліся парадак і чысціня. На жаль, уся гэта работа вядзецца фармальна. Студэнтаў не хвалюе, як выглядае аўдыторыя, ці гатова яна да зімы і г. д. Ці не таму пасля здачы экзаменаў, залікаў каля той аўдыторыі, дзе тоўпіліся студэнты, застаецца куча папер, пакінутых канспектаў, аб'едкаў і невядома адкуль прынесеных стулляў. Вінаваты тут у першую чаргу студэнты. Але не меншая ў даным выпадку і віна педагогаў, якія закрываюць на ўсё гэта вочы, не звяртаюць увагі, не робяць заўваг будучым спецыялістам.

Кожны факультэт можа і павінен рашаць спецыфічныя задачы, якія выцякаюць з асаблівасцей спецыяльнасці. Так, біёлагі, напрыклад, маглі б азеляніць нашы карпусы і інтэрнаты, забяспечыць догляд за раслінамі. Раней такі вопыт быў, і першы корпус патанаў у зеляніне. А трэнажоры, сканструяваныя рукамі выкладчыкаў нашага універсітэта і атрымаўшыя медалі на розных выстаўках, маглі б служыць добрую службу і ў нашых сценах. Ствараюцца ж пакоі і зоны адпачынку на прадпрыемствах, дык чаму мы не можам стварыць іх у нас ва ўніверсітэце, у кожным корпусе?

Навука ў гэтым напрамку ідзе наперад. Цяпер рэкамендуецца ствараць для псіхалагічнага камфорту працуючых людзей зімовыя сады. Дарэчы, яны даўно створаны ў вядучых універсітэтах краіны. Для будучых біёлагаў такі ж сад у нас мог бы стаць кропкай прыкладання ведаў і накаплення вопыту.

Студэнты-эканамісты маглі б распрацаваць праекты месц адпачынку, зрабіць эскізы інтэр'ераў буфетаў, аўдыторый і г. д. Такім чынам, сумесная бясплатная праца выкладчыкаў, супрацоўнікаў і студэнтаў па паляпшэнню знешняга выгляду карпусоў, аўдыторый, кабінетаў дазволіць павысіць агульную нашу культуру, культуру будучых маладых спецыялістаў, дасць навыкі сапраўднай грамадскай работы на карысць універсітэта, пашырыць і ўзбагаціць паняцце студэнцкага самакіравання.

**Э. ЛІЗАРАВА,**
**ст. н. с. кафедры эканомікі працы.**

*Па слядах нашых выступленняў*

# «ЧАМУ МЫ НЕ МОЖАМ ПААБЕДАЦЬ?»

Так называлася крытычная заметка студэнтаў эканамічнага факультэта, змешчаная ў газеце «Гомельскі універсітэт» за 10 сакавіка бягучага года. У ёй гаварылася аб тым, што ў буфеце галоўнага корпуса не вытрымліваецца графік работы, у выніку чаго студэнты не могуць паесці ў перапынках паміж заняткамі. Выказваліся таксама крытычныя заўвагі на недастатковы асартымент і колькасць завозімых у буфет страў.

Факты пацвердзіліся. Са скаргай рэдакцыя азнаёміла буфетчыцу галоўнага корпуса К. П. Горленка.

— Нараканні студэнтаў справядлівыя, — сказала Кацярына Паўлаўна. — Але адкрыць буфет у 11 гадзін, як гэтага патрабуе графік, у мяне няма магчымасці. Прычына — у запозненым прыходзе з гарадской аўтабазы № 4 машыны, якая развозіць са сталовай універсітэта прадукты па буфетах. А спознішся з дастаўкай, не паспяваеш ўсю ежу разагрэць як след, таму даводзіцца чуць незадаволенасць наведвальнікаў.

Накіроўваючы скаргу студэнтаў на рэагаванне адміністрацыі сталовай № 40, рэдакцыя спадзявалася атрымаць ад яе тлумачэнне прычын нерытмічнай работы транспарту, які абслугоўвае буфеты ГДУ, а таксама беднага асартыменту страў. Кіраўніцтва ж сталовай зразумела скаргу літаральна: калі пішуць аб дрэннай рабоце буфета, значыць, вінавата буфетчыца — вырашылі ў сталовай. Трэба яе пакараць за гэта. І ў пісьмовым адказе ў рэдакцыю мы прачыталі радкі: «...за дапушчаныя парушэнні правілаў гандлю буфетчыцай К. П. Горленка ёй аб'яўлена грамадская вымова і яна пазбаўлена 100% прэміяльнай даплаты за сакавік». Слоў жа аб тым, якія меры прымаліся кіраўніцтвам сталовай для таго, каб машына прыязджала ў вызначаны тэрмін, не было. Указваліся, праўда, «аб'ектыўныя» прычыны: пад'езд да буфета быў дрэнным з-за нерасчышчанага снегу. Калі нерытмічную работу аўтатранспарту раней можна было спісаць на неспрыяльныя зімовыя ўмовы, дык чым можна растлумачыць той факт, што 24 сакавіка, калі ўжо час снежных заносаў прайшоў, прадукты ў буфет галоўнага корпуса ўсё роўна былі дастаўлены са спазненнем — у 11 гадзін 45 мінут? Безадказнасцю і бескантрольнасцю кіраўніцтва сталовай!

— Цяпер, — запэўніла ў час нашай размовы загадчыца сталовай № 40 В. І. Дворкіна, — мы вядзем журнал уліку часу прыходу машыны, устанавілі кантроль, каб зрываў больш не здаралася.

Застаецца спадзявацца, што сказаныя словы не разыйдуцца са справай.

Што ж датычыць беднага асартыменту страў і іх недастатковай колькасці, то тут віна ў роўнай ступені кладзецца і на работнікаў сталовай, і на буфетчыцу. Першыя не надта абцяжарваюць сябе прыгатаваннем, акрамя традыцыйных мясных страў, больш лёгкіх і пажыўных — сырнікаў, блінчыкаў і г. д. Не была зацікаўлена ў гэтым і буфетчыца: каб рэалізаваць хутчэй стравы, старалася ўзяць іх у невялікай колькасці. Вось і атрымлівалася, што пасля 14 гадзін студэнтам не прапаноўваўся тут належны выбар.

Пытанне аб паляпшэнні грамадскага харчавання ва універсітэце закраналася на старонках нашай газеты і раней. Справу з «мёртвай кропкі» крыху ўдалося зрушыць. Быў час, калі буфеты галоўнага і першага вучэбнага карпусоў адкрываліся з самай раніцы, каб там студэнты змаглі паснедаць перад пачаткам заняткаў. Трэстам сталовых, рэстаранаў і кафэ па просьбе універсітэта выдзялялася каўбаса для бутэрбродаў, якія нарыхтоўваліся для стала самаразліку. Цяпер жа гэтага не стала. А шкада. Такая форма абслугоўвання наведвальнікаў мела свае перавагі — за кароткі час перапынку студэнты паспявалі паесці. Мэтазгодна вярнуцца да гэтага зноў.

...Ад своечасовага, рацыянальнага, каларыйнага харчавання чалавека залежыць яго здароўе. Пра гэта ніколі не павінны забываць работнікі грамадскага харчавання універсітэта. А калі ў іх рабоце здараюцца збоі, не трэба перакладваць агульную віну на плечы аднаго чалавека, як гэта здарылася ў апісаным вышэй выпадку.

Не скаргі і нараканні, а шчырыя словы ўдзячнасці людзей за добра прыгатаваную і смачную ежу павінны абавязваць работнікаў грамадскага харчавання працаваць з душой.

**Т. ДУБЯК.**

**Старонка для абітурыентаў**

# НА ВУЧОБУ ЗАПРАШАЕ ЗАВОЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ

★ ★ ★ ★

**На завочным факультэце нашага універсітэта без адрыву ад вытворчасці можна набыць вышэйшую адукацыю па спецыяльнасцях: БЕЛАРУСКАЯ І РУСКАЯ МОВА І ЛІТАРАТУРА; РУСКАЯ МОВА І ЛІТАРАТУРА; ГІСТОРЫЯ; МАТЭМАТЫКА; БІЯЛОГІЯ; ЭКАНОМІКА ПРАЦЫ; АРГАНІЗАЦЫЯ МЕХАНІЗАВАНАЙ АПРАЦОЎКІ ЭКАНАМІЧНАЙ ІНФАРМАЦЫІ; ФІЗІЧНАЕ ВЫХАВАННЕ.**

## ШЛЯХ ДА МАЙСТЭРСТВА

Рэформа агульнаадукацыйнай і прафесіянальнай школы прад'яўляе сёння высокія патрабаванні да савецкага настаўніка, да ўзроўню яго падрыхтоўкі, прафесіянальных ведаў, уменняў і навыкаў. Вось чаму стаць цяпер сапраўдным педагогам без няспыннай самаадукацыі і самавыхавання немагчыма.

Вялікую ролю ў маім прафесіянальным станаўленні адыграла вучоба на гістарычным аддзяленні завочнага факультэта універсітэта. Памятаю, як у 1974 годзе пасля звальнення ў запас з радоў Савецкай Арміі паспяхова здаў уступныя экзамены і стаў першакурснікам ГДУ. Тады ж вырашыў працаваць настаўнікам. З горада паехаў у сельскую школу. Непрыкметна праляцелі шэсць гадоў напружанай вучобы, шэсць гадоў настаўніцтва. Цяпер, калі ўспамінаю мінулае, усё часцей спыняюся на думцы: «Гэта былі самыя прадуктыўныя гады майго жыцця, на працягу якіх, вытрымліваючы жорсткае патрабаванне вучэбнай праграмы, ішоў да пастаўленай мэты». І што не менш важна — адначасова прымяняў набытыя веды ў паўсядзённай рабоце з вучнямі. Паступова прыйшло перакананне: студэнт-завочнік, які працуе па спецыяльнасці, мае велізарныя перавагі перад студэнтам стацыянара ў прафесіянальным станаўленні педагога, асабліва калі ў яго выпрацавалася ўстаноўка на прымяненне навукова-метадычных ведаў у педагагічнай працы. Нельга не пагадзіцца з псіхолагамі, якія кажуць, што першы пік прафесіянальнага майстэрства ў настаўніцкай працы дасягаецца праз пяць-шэсць гадоў працы. У гэтым сэнсе мне пашанцавала, таму што я вучыўся на завочным факультэце і ўжо на шостым курсе адчуў сябе настаўнікам у поўным сэнсе гэтага слова. Затым у жыцці сустракалася нямала прафесіянальных цяжкасцей, але пераадольваць іх, абапіраючыся на набытыя веды і вопыт, было значна лягчэй.

Бясспрэчна, сваім прафесіянальным ростам я ў многім абавязаны прафесарска-выкладчыцкаму саставу універсітэта. З пачуццём глыбокай удзячнасці разам са сваімі таварышамі - аднакурснікамі ўспамінаю лекцыі і проста чалавечныя адносіны да нас такіх чулых людзей і вопытных выкладчыкаў, як А. А. Рубан, Л. М. Гаранін, Т. П. Гараніна, М. І. Старавойтаў, Г. С. Еўдакіменка, З. М. Сямейных, М. В. Гусева, Р. Р. Лазько.

Важнае значэнне ва ўдасканальванні свайго педагагічнага майстэрства адыграла паглыбленае вывучэнне праблем педагогікі і псіхалогіі на старэйшых курсах. Адначасова з гэтым на сваіх уроках у школе апрабіраваліся розныя псіхолага-педагагічныя ідэі, ажыццяўлялася эксперыментальнае навучанне па авалодванню школьнікамі паняццяў, фарміраванню ў іх інтэлектуальных уменняў і навыкаў. Гэтым праблемам былі прысвечаны мае навуковая і дыпломная работы.

Не ўяўляю паспяховага пераадольвання тых цяжкасцей, якія сталі на маім шляху, без навукова-практычных рэкамендацый прафесара І. Ф. Харламава. Асабліва каштоўнай была сумесная творчая работа па ўкараненню псіхолага-педагагічных ідэй па актывізацыі пазнавальнай дзейнасці пад кіраўніцтвам дацэнта А. В. Саннікавай. Дзелавыя адносіны з Аннай Васільеўнай, як з чалавекам і вучонай, дапамагалі мне з дня ў дзень удасканальваць сваё майстэрства выхавацеля, імкнуцца ператвараць кожны ўрок у творчую лабараторыю педагога, асэнсоўваць свой вопыт і вопыт калег з пазіцый навукі.

Цяпер, калі ўжо мінула амаль сем гадоў пасля заканчэння універсітэта, калі на плечы легла мноства паўсядзённых клопатаў па кіраўніцтву работай вялікага калектыву педагогаў, іншы раз адчуваеш, якую вострую патрэбу маеш у жывых чалавечных зносінах, парадах сваіх былых і, напэўна, стаўшых назаўсёды пастаяннымі старэйшых настаўнікаў.

**І. ТАЛКАЧОЎ,**
**дырэктар СШ № 25 г. Гомеля,**
**выпускнік завочнага факультэта ГДУ 1980 года.**

## ЁСЦЬ ЖАДАННЕ— БУДЗЕ ПОСПЕХ

Як вядома, за апошні час роля матэматыкі значна ўзрасла. Сёння ўжо нікога не здзівіш тым, што яна выкарыстоўваецца не толькі ў традыцыйных галінах — фізіцы, механіцы, але і біялогіі, у задачах хімічнай кінетыкі і гарэння і г. д. Акрамя таго, прымяненне матэматыкі не абмяжоўваецца даследаваннем натуральных працэсаў. Цяпер без яе не абысціся і пры праектаванні складанай вылічальнай тэхнікі.

На завочным факультэце ў рамках спецыяльнасці «матэматыка» навучанне праводзіцца па двух патоках: навукова-вытворчым і навукова-педагагічным. Размеркаванне студэнтаў па спецыялізацыях праводзіцца на чацвёртым курсе. Вытворчы паток спецыялізуецца па вылічальнай матэматыцы. Кіруе гэтай спецыялізацыяй кафедра вылічальнай матэматыкі і праграміравання. Кафедра матэматычнага аналізу ажыццяўляе спецыялізацыю на педагагічным патоку. Падрыхтоўку матэматыкаў вядуць высокакваліфікаваныя кадры. Так, на кафедры матэматычнага аналізу са студэнтамі-завочнікамі працуе 7 кандыдатаў фізіка-матэматычных навук, на кафедры ВМ і праграміравання — доктар фізіка-матэматычных навук і 5 кандыдатаў фізіка-матэматычных і тэхнічных навук.

Акрамя вышэй названых кафедр, агульную падрыхтоўку спецыялістаў вядуць кафедры алгебры і геаметрыі, дыферэнцыяльных ураўненняў, тэорыі імавернасцей і матэматычнай статыстыкі, матэматычных праблем кіравання. Навуковыя інтарэсы выкладчыкаў кафедр ахопліваюць самыя шырокія галіны матэматычных ведаў: тэорыю канечных груп, тэорыю звычайных дыферэнцыяльных ураўненняў, тэорыю набліжэнняў, тэорыю тапалагічных груп, матэматычную і прыкладную тэорыю пругкасці, тэорыю матэматычных праблем кіравання і інш.

Выпускнікі завочнага факультэта спецыяльнасці «матэматыка» паспяхова працуюць у народнай гаспадарцы. Многія з іх сталі вядучымі спецыялістамі сваіх падраздзяленняў: В. І. Клёнаў — начальнік сектара КБ завода РТА, М. В. Маркелаў — вядучы інжынер канструктарскага бюро. Матэматыкаў з дыпломамі Гомельскага дзяржаўнага універсітэта можна сустрэць на заводзе імя С. М. Кірава, у ВА «Гомсельмаш». У школах таксама працуюць выпускнікі завочнага факультэта. Адначасовая вучоба ва універсітэце і праца дазваляюць такім студэнтам як А. Жаўняк, Н. Грамыка, І. Капыгіна паспяхова спраўляцца з абавязкамі настаўніка.

Трэба адзначыць, што вучоба на спецыяльнасці «матэматыка» не з лёгкіх. Не ўсім студэнтам удаецца паспяхова спалучаць працу з вучобай. Для гэтага неабходна сапраўдная любоў да выбранай спецыяльнасці.

**Д. ЮШЧАНКА,**
**дацэнт кафедры матаналізу.**

## НЯЛЁГКА, АЛЕ ЦІКАВА

Шосты год я вучуся на завочным факультэце універсітэта. Нельга сказаць, што лёгка спалучаць вучобу з працай. Даводзіцца цяжка. Асабліва, калі маеш сям'ю, дзяцей. Найбольш складана, калі працуеш не па спецыяльнасці. Хачу сказаць: выкладчыкі даюць нам усё магчымае. Іншы раз за адну лекцыю даведаешся столькі, колькі не атрымаеш ад падручніка за цэлы дзень. Хочацца, каб такіх лекцый было як мага больш. Для гамяльчан іх можна чытаць і ў міжсесійны перыяд.

Галоўная наша праблема — падручнікі. Пастаянна адчуваецца іх недахоп. Таму да экзаменаў даводзіцца рыхтавацца ў асноўным па канспектах. Задача заключаецца ў актыўнай самападрыхтоўцы.

Яшчэ раз скажу: вучыцца цяжка, але вельмі цікава. Непрыкметна праходзяць гады. Цяпер часта ўспамінаюцца ўступныя экзамены, першы курс. Тады думалася, што да шостага курса вельмі далёка. А зараз — фініш. Здавалася, што няма больш ніякіх сіл. Але ў той жа час быццам бы дзіўна. Хутка не трэба будзе рыхтавацца да сесіі і здаваць экзамены.

Вучоба ў мяне заўсёды была на першым плане. Аднак часта для яе не хапала часу, а, магчыма, характару, настойлівасці. У гэтым неяк няёмка і прызнавацца. Разам з тым вучоба ва універсітэце мяне шмат чаму навучыла: і самастойнай рабоце, і правільнай ацэнцы сваіх сіл і магчымасцей.

Сёння хочацца шчыра сказаць: «Дзякуй, універсітэт! Дзякуй за тыя веды, якія ты нам даў, за тое, што ўмацаваў веру ў сябе і ў свае сілы».

**Е. ГОЛУБЕВА,**
**студэнтка 6-га курса аддзялення АМАЭІ, тэхнік-тэхнолаг Гомельскага станкабудаўнічага завода імя С. М. Кірава.**

● **На завочным факультэце нашага універсітэта вышэйшую адукацыю набывае звыш трох тысяч чалавек.**

● **Вучэбныя заняткі са студэнтамі-завочнікамі вядуць 311 высокакваліфікаваных выкладчыкаў. Большая палавіна з іх маюць вучоныя ступені і званні, 7 — доктары навук, прафесары.**



**НА ЗДЫМКУ:** кансультацыю студэнтцы-завочніцы І. Крукавай дае асістэнт кафедры рускага, агульнага і славянскага мовазнаўства Н. А. Старасценка.

Фота А. Ульянкінай.

*Юрыдычная даведка*

## ІЛЬГОТЫ ДЛЯ СТУДЭНТАЎ-ЗАВОЧНІКАЎ

Рабочым і служачым, якія допушчаны да ўступных экзаменаў у вышэйшыя навучальныя ўстановы, прадастаўляецца водпуск без захавання заработнай платы працягласцю 15 каляндарных дзён, не ўлічваючы часу на пераезд да месца знаходжання ВНУ і назад.

На перыяд установачных заняткаў, выканання лабараторных работ, здачы залікаў і экзаменаў для студэнтаў першага і другога курсаў завочнага навучання прадастаўляюцца дадатковыя водпускі з захаваннем сярэдняй заработнай платы працягласцю 30 каляндарных дзён, на астатніх курсах — 40 каляндарных дзён штогодна, але не больш 100 рублёў у разліку на месяц.

На перыяд здачы дзяржаўных экзаменаў прадастаўляецца дадатковы аплочваемы водпуск на 30 каляндарных дзён, на перыяд падрыхтоўкі і абароны дыпломнага праекта (работы) — на чатыры месяцы.

Рабочым і служачым, якія набываюць вышэйшую адукацыю па завочнай форме навучання, на працягу 10 вучэбных месяцаў перад пачаткам выканання дыпломнага праекта (работы) або здачы дзяржаўных экзаменаў прадастаўляецца пры шасцідзённым рабочым тыдні адзін свабодны ад работы дзень у тыдзень для падрыхтоўкі да заняткаў з аплатай яго ў размеры 50% сярэдняй заработнай платы па асноўнаму месцу работы, але не ніжэй устаноўленага мінімальнага размеру заработнай платы.

Пры пяцідзённым рабочым тыдні колькасць вольных ад работы дзён змяняецца ў залежнасці ад працягу рабочай змены пры захаванні колькасці вольных ад работы гадзін.

Кіраўнікі прадпрыемстваў, устаноў, арганізацый могуць прадастаўляць на працягу ўказаных 10 вучэбных месяцаў студэнтам, па іх жаданню, дадаткова яшчэ 1—2 дні ў тыдзень без захавання заработнай платы.

Кіраўнікі прадпрыемстваў, устаноў, арганізацый па рэкамендацыі адпаведных навучальных устаноў могуць прадастаўляць рабочым і служачым, якія вучацца на апошнім курсе, дадатковы месячны водпуск без захавання заработнай платы для азнаямлення непасрэдна на вытворчасці з работай па выбранай спецыяльнасці і падрыхтоўкі матэрыялаў для дыпломнага праекта (работы).

Праезд да месца знаходжання навучальнай установы і назад студэнтаў ВНУ, якія займаюцца па завочнай форме навучання, на ўстановачныя заняткі, для выканання лабараторных работ, здачы залікаў і экзаменаў адзін раз у год аплачваецца за кошт прадпрыемстваў, устаноў, арганізацый, дзе яны працуюць, у размеры 50% кошту праезду адпаведным відам транспарту прымяняльна да парадку, устаноўленаму заканадаўствам аб службовых камандзіроўках.

**В. РУПІН,**
**юрысконсульт ГДУ.**

